Кранальна і вельмі шчымліва гучаць гэтыя радкі, што ідуць ад сэрца паэткі.А вось яшчэ адзін метафарычны вобраз Беларусі, які з цеплынёй і замілаваннем паказвае аўтару вершы «Пятру Клімуку»: *То ж Беларусь наша ў хустачцы белай, можа, ў квяцістай святочнымі днямі, узгадаваць свайго сына сумела, – узвіўся арлом з дарагімі сябрамі* [3]. Тут перад чытачом Беларусь паўстае матуляй «у хустачцы белай».

Такім чынам, лексемы са значэннем белага колеру надаюць мастацкую і стылёвую адметнасць творам Ларысы Геніюш, служаць для стварэння трапных, запамінальных вобразаў.

**ЛІТАРАТУРА**


1. Марціноўскі, П. Наша Лорка: Успаміны і вершы пра Ларысу Геніюш / П. Марціноўскі. – Слонім, 2002. – 56 с.
2. Геніюш, Л. Выбраныя творы / Л. Геніюш. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – 616 с.
3. Геніюш, Л. На чабары настоена: Лірыка / Л. Геніюш. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 143 с.
4. Геніюш, Л. Белы сон: Вершы і паэмы / Л. Геніюш. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 351 с.


УДК 821. 161.3

## АСВЕТНІЦКІ СУБСТРАТ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ. ПРАЦА У. КАРАТКЕВІЧА НА НІВЕ АСВЕТНІЦТВА

**Банцэвіч П. К.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Паняцце «Асветніцтва» з’яўляецца трансгістарычнай канцэптуальнай катэгорыяй і ўніверсаліяй культуралогіі, карыснай для рэканструкцыі асобнага шляху беларускай культуры. У якасці адметнай рысы беларускага асветніцтва можна назваць яго прыкладны характар, канкрэтна-практычную дзейнасць па тлумачэнню агульнавядомых, успрынятых іншымі народамі ісцін, якія для Беларусі былі і па-ранейшаму застаюцца надзённымі: абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, фаміраванне гістарычнага мыслення, выхаванне патрыятызму. Асветніцкія ідэі рэалізоўваліся ў спецыфічных беларускіх умовах у некалькіх культурна-гістарычных мадэлях: асветніцтва як культурная з’ява сярэднявечча, Рэнесансу, класічнае Асветніцтва, сімбіёз асветніцтва і рамантызму і інш. Асветніцтва вызначае сутнасць беларускай культуры, адметнасці развіцця ў сучаснай цывілізацыйнай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Аналізуючы асаблівасці асветніцкай парадыгмы, мэтазгодна, на наш погляд, «працягнуць ланцужок» ад першых асветнікаў беларускай зямлі праз плеяду знакамітых дзеячоў эпохі Рэнесансу, Асветніцтва, рамантызму, нацыянальнага адраджэння да савецкай і постсавецкай эпох. Можна адзначыць, што асветніцкая ідэалогія была актуальна не толькі ва ўмовах фармавання беларускай нацыі, але і ў савецкі час, стаўшы адной з галоўных інтэнцый творчасці У. Караткевіча. Гэта дазваляе вызначыць непарыўнасць асветніцкай плыні ў беларускай культуры, сведчыць пра яе надзённасць і актуальнасць і ў наш час.

У савецкую эпоху агітацыйна-асветніцкі напрамак творчасці У. Караткевіча дыктаваўся ідэйна-эстэтычным супрацьстаяннем афіцыйнай прапагандзе «сацыялістычнага інтэрнацыяналізму». У якасці альтэрнатывы мастак дэманстраваў як самае эстэтычна высокае – памяць да продкаў, да нацыянальных традыцый, да роднай мовы і культуры. Як выклік гучалі яго творы, якія ў розных варыяцыях сцвярджалі вернасць агульначалавечым і нацыянальным каштоўнасцям [3].

Праца У. Караткевіча на ніве асветніцтва ажыццяўлялася ў некалькіх кірунках. Першы быў акцэнтаваны на грамадскую актывізацыю беларускіх мас, выхаванне ў іх культурнай ідэнтычнасці, абуджэнне нацыянальнай свядомасці. У. Караткевіч прымаў удзел у грамадскіх арганізацыях, выступаў у абарону прыроды, ахоўваў помнікі гісторыі і культуры, арганізоўваў іх рэстаўрацыі, уважліва сачыў за беларускім канфесійным, літаратурна-мастацкім жыццём, унікаў у самыя розныя праблемы, што былі складанымі і балючымі для Беларусі. Мастак адчуваў патрэбу ў публічным, дэманстрацыйным зацвярджэнні беларускіх каштоўнасцей, актыўна працаваў у галіне публіцыстыкі, журналістыкі, што былі асяродкам нацыянальна-патрыятычнага выхавання народа, выконвалі ролю рупара асветніцкіх ідэй.

Другі кірунак асветніцкай дзейнасці У. Караткевіча – пазнавальна-дыдактычны. Яго мэтай з’яўлялася павышэнне ўзроўню адукаванасці беларускага грамадства, уплыў на развіццё інтэлектуальнай думкі, пашырэнне ведаў пра радзіму і свой народ. Праз цікавую інфармацыю па гісторыі, этнаграфіі, архітэктуры, археалогіі, выяўленчаму мастацтву, мовазнаўству пісьменнік далучаў чытачоў да скарбаў айчыннай і сусветнай культуры. Асаблівае месца займаюць тут сустрэчы з моладзю.

Трэцім кірункам асветніцкай дзейнасці У. Караткевіча з’яўляецца літаратурна-мастацкі, куды ўваходзяць мастацкая творчасць, пераклады, стварэнне музеяў, праца ў галіне нацыянальнай драматургіі і кінематографа.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

У. Караткевіч разглядаў як сваю кроўную справу выданне шматтомнага «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», часопісу «Наш край», рашуча выступаў за адкрыццё Музея народнай архітэктуры і быту. Мастак меў на мэце здзівіць суайчыннікаў, паказаць, што на Беларусі ёсць замкі, храмы, палацы, вартыя дбайнай аховы [2]. Фільм «Памяць», выйшаўшы на экраны, выконваў такую задачу. На Беларускім тэлебачанні У. Караткевіч стварыў праграму «Спадчына», прысвечаную гісторыі і культуры беларускай зямлі і разлічаную на самае шырокае кола гледачоў.

Адной з важнейшых задач сваёй творчасці пісьменнік лічыў папулярызацыю дасягненняў сусветнай літаратуры сярод беларускіх чытачоў. Гэта абумовіла ўвагу У. Караткевіча як перакладчыка да творчасці Т. Шаўчэнкі, І. Франко, А. Міцкевіча, Ц. Норвіда, А. Талстога. У. Караткевіч займаўся таксама перакладамі з латышскай, літоўскай, грузінскай, славацкай, чэшскай, туркменскай моў, выступаў з крытычнымі артыкуламі па пытаннях мастацкага перакладу [1].

У сваёй дзейнасці У. Караткевіч выходзіць за межы літаратуры. Ён гісторык і этнограф, культуролаг і мастацтвазнаўца, педагог і ідэолаг нацыянальнага адраджэння, які абвяшчаў: мой народ еўрапейскі, гераічны, высокакультурны і духоўна багаты.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Верабей, А. Абуджаная памяць: Нарыс жыцця і творчасці У. Караткевіча / А. Верабей. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 255 с.
2. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 229 с.
3. Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літаратурнай творчасці / А. Русецкі. – Мінск: Маст. літ., 2000. – 300 с.

УДК 811.161.1(075.8)

## ПРОИСХОЖДЕНИЕ ГРАММАТИКИ ЯЗЫКА

**Белова О. И.**
УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

На протяжении многих лет грамматика является предметом самых интенсивных обсуждений и дискуссий среди лингвистов и преподавателей иностранных языков. Да и ни одному изучающему иностранный язык не нужно говорить, что грамматика сложна. Изменяя последовательности слов и добавляя ряд вспомогательных глаголов и



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ